**Кампанія «Права выбару-2016»**

**па назіранні за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь VI склікання**

## Прамежкавая ацэнка ўмоваў перадвыбарчай агітацыі

**5 верасня 2016 г.**

*Кампанія «Права выбару-2016» ладзіць доўгатэрміновае назіранне за ходам выбарчай кампаніі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі сіламі арганізацый, што ўваходзяць у кампанію**. *Гэтая справаздача з'яўляецца пятым дакументам па выніках доўгатэрміновага назірання і ахоплівае этап ажыццяўлення перадвыбарчай агітацыі.*

**Агульныя высновы:**

- Уведзеная ў Выбарчы кодэкс у 2013 годзе адмова ад дзяржаўнага фінансавання агітацыіўпершыню была выкарыстаная на ўзроўні парламенцкіх выбараў. Практыка сведчыць, што адсутнасць дзяржаўнага фінансавання абумовіла малую колькасць агітацыйнай прадукцыі і рэкламы кандыдатаў, што нашкодзіла азнаямленню выбаршчыкаў з кандыдатамі.

- Закрыты характар фармавання выбарчых фондаў і непублічнасць інфармацыі пра крыніцы паступлення туды сродкаў, адсутнасць забароны на пералічэнне ў выбарчыя фонды сродкаў дзяржаўных прадпрыемстваў (апроч тых, што фінансуюцца з бюджэту), шырокі ўдзел у агітацыі грамадскіх аб'яднанняў, што фінансуюцца з бюджэту (БРСМ, ФПБ, Белая Русь ды інш), арганізацыя агітацыі праз працоўныя калектывы арганізацый і прадпрыемстваў, што цалкам альбо часткова фінансуюцца з бюджэту, удзел у агітацыі партый, што атрымліваюць ад дзяржавы матэрыяльную падтрымку ў неграшовым выглядзе (КПБ і РППС, якім урадам устаноўлены ільготныя стаўкі арэнды дзяржаўных памяшканняў) дазваляюць зрабіць выснову: агітацыйная кампанія лаяльных выканаўчай уладзе кандыдатаў па-ранейшаму ажыццяўляецца за кошт дзяржавы, у той час як апазіцыйныя кандыдаты гэткай падтрымкі пазбаўленыя.

- Пры распаўсюдзе агітацыйных матэрыялаў у розных формах дзяржаўныя СМІ і выбарчыя камісіі ўжывалі цэнзуру: зафіксаваныя адмовы ў публікацыі перадвыбарчых праграм і выпуску ў эфір тэле- і радыёвыступаў кандыдатаў, сістэмна ўжывалася рэдактура і маніпуляцыі з біяграфічнымі звесткамі кандыдатаў і іх фотаздымкамі, што прадстаўляліся кандыдатамі ў акруговыя камісіі (АВК) для размяшчэння на агульных плакатах, якія друкуюцца АВК, некаторыя камісіі незаконна патрабавалі папярэдняга ўзгаднення з імі тэкстаў улётак.

- Дзяржаўныя СМІ ажыццяўлялі асвятленне агітацыйнай дзейнасці кандыдатаў, лаяльных выканаўчай уладзе, у той час як дзейнасць апазіцыйных кандыдатаў і партый замоўчвалася. У шэрагу выпадкаў у агітацыі на карысць праўладных кандыдатаў удзельнічалі сябры выбарчых камісій, а таксама назіралася ўмяшальніцтва АВК у правядзенне сустрэч з выбаршчыкамі.

---

* ***Пра кампанію "Права выбару-2016":*** *«Права выбару-2016» - гэта кампанія па назіранні за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, скіраваная на прадухіленне парушэнняў заканадаўства падчас усіх стадый выбарчай кампаніі, фіксацыю парушэнняў і аператыўнае рэагаванне. Кампанія назірання «Права Выбару-2016» аб'ядноўвае восем палітычных і грамадзянскіх структур: Партыю БНФ, Беларускую Хрысціянскую Дэмакратыю, Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (Грамаду), Праваабарончa-асветніцкае грамадскае аб'яднанне «Рух «За свабоду!», Аб'яднаную грамадзянскую партыю, Беларускую партыю «Зялёныя», аргкамітэт Партыі Свабоды і Прагрэсу, прафсаюз Радыёэлектроннай прамысловасці. Асноўнай адметнай рысай дадзенай кампаніі ад кампаній назірання, якія праводзяць праваабарончыя арганізацыі або міжнародныя назіральнікі, з'яўляецца скіраванасць на «актыўнае назіранне», якое ўключае ў сябе мабілізацыю валанцёраў не толькі для фіксацыі, але і для актыўнага процідзеяння парушэнням.*

## Прававое рэгуляванне перадвыбарчай агітацыі

У адпаведнасці з зацверджаным ЦВК каляндарным планам, правядзенне перадвыбарчай агітацыі ажыццяўляецца ад дня рэгістрацыі кандыдатаў 10 жніўня па 10 верасня ўключна.

Згодна з арт.45 Выбарчага кодэкса, грамадзянам Беларусі, палітычным партыям, іншым грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам, давераным асобам кандыдатаў, прадастаўляецца права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання перадвыбарчых праграм кандыдатаў у дэпутаты, іх палітычных, дзелавых і асабістых якасцяў, правядзення агітацыі за ці супраць кандыдата на сходах, мітынгах, у СМІ, а таксама падчас сустрэч з выбаршчыкамі. Замежныя грамадзяне не маюць права ўдзельнічаць у агітацыі.

Арт.47 Выбарчага кодэкса ўстанаўлівае абмежаванні на правядзенне агітацыі. Забараняецца агітацыя, пры правядзенні якой ажыццяўляецца прапаганда вайны, утрымліваюцца заклікі да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі, абразы і паклёп у дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у дэпутаты, а таксама заклікі, якія заахвочваюць або якія маюць сваёй мэтай заахвочванне да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў. Забараняюцца агітацыя ці прапаганда сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або моўнай перавагі, выпуск і распаўсюд паведамленняў і матэрыялаў, якія распальваюць сацыяльную, расавую, нацыянальную ці рэлігійную варожасць. Пры правядзенні перадвыбарчай агітацыі забараняецца раздаваць грашовыя сродкі, падарункі і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, праводзіць ільготны распродаж тавараў, бясплатна прадастаўляць любыя паслугі і тавары, за выключэннем агітацыйных друкаваных матэрыялаў, спецыяльна выраблeных з захаваннем патрабаванняў Выбарчага кодэкса для выбарчай кампаніі. Пры правядзенні перадвыбарчай агітацыі забараняецца ўздзейнічаць на грамадзян абяцаннямі перадачы ім грашовых сродкаў, матэрыяльных каштоўнасцяў.

Варта адзначыць, што бягучая выбарчая кампанія сталася першымі выбарамі дэпутатаў парламенту, пры якіх дзейнічае памянёная забарона на заклікі зрыву выбараў, што трактуецца як забарона агітацыі за байкот выбараў.

Парадак выкарыстання дзяржаўных СМІ для публікацыі праграм кандыдатаў (у газетах) і выступаў кандыдатаў у тэле- і радыёэфіры ды парадак правядзення тэледэбатаў быў урэгуляваны Палажэннем аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, якое было зацверджанапастановай ЦВК ад 28 чэрвеня 2016 года №32. На перыяд выбараў пастановай ЦВК ад 28 чэрвеня 2016 года №33 быў створаны Назіральны савет па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі. Традыцыйна ў склад гэтага органа, які мусіць разглядаць спрэчкі ў галіне выкарыстання дзяржаўных СМІ падчас агітацыйнай кампаніі, увайшлі толькі прадстаўнікі дзяржаўных СМІ і лаяльнага ўладам Саюзу журналістаў. Адметнасцю складу гэтага органа ў межах бягучай кампаніі сталася тое, што ўжо пасля яго фармавання дадатковым рашэннем ЦВК у яго быў кааптаваны прадстаўнік незалежнай Беларускай асацыяцыі журналістаў.

## Фінансаванне перадвыбарчай агітацыі

Згодна з арт.48[1] Выбарчага кодэксу, кандыдаты ў дэпутаты ад моманту рэгістрацыі могуць фармаваць выбарчыя фонды для фінансавання выдаткаў сваёй агітацыйнай кампаніі. Варта адзначыць, што ў адрозненне ад выбараў Прэзідэнта, гэткія фонды не могуць быць створаныя на этапе вылучэння кандыдатаўу дэпутаты і працы ініцыятыўных груп.

Парадак фармавання і выкарыстання выбарчых фондаў быў вызначаны Палажэннем аб выбарчым фондзе кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу

Рэспублікі Беларусь шостага склікання, якое было зацверджана пастановай ЦВК ад 8 чэрвеня 2016 года № 30).

Сродкі выбарчага фонду выкарыстоўваюцца ў мэтах фінансавання выдаткаў на агітацыю. Максімальная сума выбарчага фонду складае 1000 базавых адзінак (сума эквівалентная прыкладна 10 000 эўра). Яна можа быць унесеная як цалкам самім кандыдатам, так і за кошт ахвяраванняў, пры гэтым максімальны памер кожнага ахвяравання не можа перавышаць 5 базавых (сума эквівалентная прыкладна 50 эўра) адзінак для фізічных асобаў альбо 10 базавых адзінак (сума эквівалентная прыкладна 100 эўра) для юрыдычных асобаў.

Забаронена рабіць ахвяраванні замежным дзяржавам і арганізацыям; замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства; міжнародным арганізацыям; арганізацыям, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства; арганізацыям, якія атрымлівалі на працягу года, што папярэднічае дню ўнясення ахвяравання, замежную бязвыплатную дапамогу ад замежных дзяржаў, замежных арганізацый, міжнародных арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, а таксама ад ананімных ахвярадаўцаў, калі атрыманая гэтымі арганізацыямі замежная бязвыплатная дапамога не была імі вернутая гэтым замежным дзяржавам, замежным арганізацыям, міжнародным арганізацыям, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства або ў выпадку немагчымасці вяртання не была пералічаная (перададзеная) у даход дзяржавы да дня ўнясення ахвяравання ў выбарчы фонд; грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія не дасягнулі 18 гадоў; дзяржаўным органам і органам мясцовага самакіравання; арганізацыям, якія цалкамці часткова фінансуюцца з бюджэту; арганізацыям, зарэгістраваным ва ўстаноўленым парадку менш чым за адзін год да дня ўнясення ахвяравання; дабрачынным і рэлігійным арганізацыям; ананімным ахвярадаўцам.

Варта адзначыць, што дадзены пералік забароненых суб'ектаў ахвяравання не ўключае ў сабе прадпрыемствы і арганізацыі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай (рэспубліканскай альбо камунальнай) уласнасці – забарона датычыцца толькі арганізацый, што фінансуюцца з бюджэту. З улікам дамінуючай ролі дзяржавы як уласніка і дзяржаўных прадпрыемстваў у беларускай народнай гаспадарцы гэта стварае зручныя ўмовы для фінансавай падтрымкі за дзяржаўны (хоць і небюджэтны) кошт тых кандыдатаў, якія карыстаюцца падтрымкай з боку выканаўчай улады.

Адсутнасць празрыстасці ў фармаванні выбарчых фондаў (у тым ліку не апублікаванне звестак пра прадпрыемствы, што рабілі ахвяраванні) не дазваляе ацаніць, наколькі маштабна дзяржаўныя прадпрыемствы фінансавалі агітацыйныя кампаніі лаяльных уладам кандыдатаў: згодна з вызначаным ЦВК палажэннем. Публікацыі падлягаюць толькі звесткі пра агульную суму атрыманых у выбарчы фонд ахвяраванняў і пра агульную суму зробленых кандыдатамі выдаткаў.

Агулам 355 кандыдатаў (68% ад агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў) адчынілі ў "Беларусбанку" рахункі для збору дабраахвотных ахвяраванняў у мэтах папаўнення сваяго выбарчага фонду. Разам з тым, насуперак патрабаванням пастановы ЦВК ад 8 чэрвеня 2016 года №22 "Аб інфармаванні грамадзян пра працу па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання" інфармацыя пра адкрыццё кандыдатамі выбарчых рахункаў з указаннем рэквізітаў не была размешчаная ў раздзелах "Выбары-2016" на сайтах некаторых аблвыканкамаў (напрыклад, Магілёўскага) і Мінгарвыканкама.

У адрозненне ад мінулых парламенцкіх выбараз 2012 года, падчас бягучай кампаніі не была пашыраная практыка замаруджвання і валакіты з боку банкаў у справе адкрыцця адмысловых выбарчых рахункаў: большасць кандыдатаў мела магчымасць зрабіць гэта досыць аператыўна.

**Выступы кандыдатаў на дзяржаўным тэлебачанні і радыё**

Згодна з вызначаным ЦВК парадкам, кандыдаты маюць права на пяціхвілінны выступ на дзяржаўным радыё і пяціхвілінны выступ на дзяржаўным тэлебачанні. Тэледэбаты праводзяцца пры наяўнасці згоды на ўдзел у іх больш чым аднаго кандыдата, пры гэтым замест кандыдата за яго можа выступіць яго давераная асоба. Выступы і дэбаты транслююцца ў запісе.

У адрозненне ад ранейшых выбарчых кампаній, для трансляцыі тэлевыступаў быў абраны непапулярны дзяржаўны канал Беларусь-3, які саступае ў аўдыторыі іншым дзяржаўным каналам. У адрозненне ад практыкі мінулых выбараў 2012 і 2015 года, выступы кандыдатаў і трансляцыі тэледэбатаў не былі трансляваныя на інтэрнэт-сайтах тэлекампаній, запісы выступаў таксама не выкладаліся арганізатарамі ў інтэрнэт. У праграме перадач не былі канкрэтызаваныя акругі і кандыдаты, якія падлягалі трансляцыі. Гэтыя абставіны істотна паменшылі магчымасці выбарчыкаў азнаёміцца з вытупамі і дэбатамі.

Белтэлерадыёкампанія зрабіла не заснаваную на законе заяву пра забарону размяшчэння запісаў тэлевыступаў кандыдатаў ў інтэрнэце, спасылаючыся на памылковае сцвярджэнне пра тое, што аўтарскія правы на гэтыя матэрыялы належаць кампаніі і яны не могуць быць размешчаныя ў інтэрнэце без яе згоды. Паведамлялася, што размешчаны на сайце youtube.com выступ кандыдата ад АГП па Свіслачскай акрузе №94 Юрыя Хашчавацкага быў выдалены на патрабаванне Белтэлерадыёкампаніі.

Як паведаміў старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, 77 кандыдатаў (ці каля 15% ад агульнай колькасці) не скарысталіся правам на тэлевыступ: у Менску і Гомелі на запіс не прыйшлі па 11 чалавек, Магілёве — 15, Берасьці — 23, Віцебску — 10, Горадні — 7.

Выпадкі цэнзуравання і невыпуску ў эфір запісаных кандыдатамі выступаў былі меньш пашыраныя чым на парламенцкіх выбарах 2012 года, але таксама фіксаваліся і цяпер. Напрыклад, запісаныя на радыё і тэлебачанні выступы кандыдат ад АГП па Паўднёва-Заходняй акрузе №98 Паўла Стэфановіча не быў пушчаны ў эфір з той прычыны, што кандыдат прапагандаваў у выступе ідэю легалізацыі марыхуаны, хоць гэткая тэма не падпадае пад забароны і абмежаванні для агітацыйнай дзейнасці. Таксама не быў пушчаны ў эфір тэлевыступ кандыдата ад АГП па Смаргонскай акрузе №59 Міколы Уласевіча, які заклікаў супраць будаўніцтва ў Беларусі АЭС. Шляхам мантажу з тэлевыступу кандыдата ад АГП па Гомельскай-Юбілейнай акрузе №31 Уладзіміра Няпомняшчых быў выдалены надпіс на майцы "За Беларусь без Лукашэнкі". Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына зрабіла заяву пра тое, што ў выступах кандыдатаў не павінныя закранацца пытанні дзяржаўнай палітыкіі развіцця краіны ў цэлым, а павінныя быць пытанні, датычныя толькі той акругі, дзе балатуецца кандыдат. Фактычна такім чынам старшынёй ЦВК была санкцыянаваная незаконная практыка цэнзуравання выступаў.

Давераная асоба кандыдатапа Крычаўскай акрузе №83 Тацціяны Шамбалавай, сустаршыня аргкамітэта партыі БХД Віталь Рымашэўскі, пры ўдзеле ў тэледэбатах сутыкнуўся з перадузятым стаўленнем вядучага галоўнага рэдактара тэлебачання Андрэя Скарабагатава пры запісе 23 жніўня. Скарабагатаў перабіваў выступ Рымашэўскага, перакрыкваў, казаў паралельна з ім, не даючы цалкам выкарыстоўваць адведзены для выступлення час.Да апаненткі Рымашэўскага - старшыні Крычаўскага раённага савета дэпутатаў Тацціяне Марачковай - стаўленне было больш лаяльным. Апазіцыйная кандыдатка падала скаргу ў Магілёўскую абласную камісію, угледзеўшы ў дзеяннях Скорабагатава дыскрымінацыю па палітычных матывах і патрабуючы перазапісу тэледэбатаў, аднак скарга была адхіленая ТВК.

Кандыдаты ў дэпутаты ад Партыі БНФ заявілі пра парушэнне моўных стандартаў пра арганізацыі тэледэбатаў: у прыватнасці ў Гародні, нават тады, калі усе ўдзельнікі дэбатаў вялі размову на беларускай мове, вядучая дэбатаў карысталася толькі рускай мовай.

**<u>Публікацыя перадвыбарчых праграмаў</u>**

Згодна з пастановай ЦВК, кандыдаты мелі права апублікаваць сваю перадвыбарчую праграму памерам у 4000 знакаў (дзьве старонкі) ў адной з рэспубліканскіх газет ( «Звязда», «Народная газета», «Рэспубліка»), або ў адпаведнай абласной, Мінскай гарадской газеце ( «Заря», «Віцебскія весткі», «Гомельская праўда», «Гродзенская праўда», «Мінская праўда», «Магілёўскія ведамасці», «Вячэрні Мінск»), або ў раённай (раённых), гарадской (гарадскіх) газетах, што выдаюцца на тэрыторыі выбарчай акругі, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі, альбо якія часткова фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэту або адным з заснавальнікаў якіх выступаюць дзяржаўныя органы ці арганізацыі. Праграмы павінны былі быць перададзеныя ў рэдакцыі газэт не пазней за 21 жніўня і публікаваліся ў парадку паступлення.

386 кандыдатаў (альбо 74% ад колькасці зарэгістраваных кандыдатаў) падалі для публікацыі свае перадвыбарчыя праграмы.

Некаторыяапазіцыйныя кандыдаты паведамілі пра перашкоды ў апублікаванні праграм. Напрыклад, кандыдатка ад Партыі БНФ Наталля Ільініч па Пухавіцкай акрузе №65 паведаміла, што яе праграма была апублікаваная толькі ў адной з двух газет, што выдаюцца на тэрыторыі акругі: праграму размясціла пухавіцкая раённая газэта "Пухавіцкія навіны", куды яе аднесла кандыдатка асабіста, а спроба даверанай асобы кандыдаткі падаць праграму ў раённую газету Старадарожскага раёна "Навіны Старадарожчыны" апынулася няўдалая, паколькі 20 жніўня ў нядзелю рэдакцыя газеты апынулася зачыненая (скарга на парушэнне з боку рэдакцыі СМІ была адхіленая ТВК). Кандыдат ад Партыі БНФ па Дамброўскай акрузе №103 Васіль Астроўскі, які балатуецца ў Мінску, падаў для публікацыі праграму ў дзяржаўную газету "Мінскі кур'ер", што выдаецца Мінгарвыканкамам і падпадае пад катэгорыю тых выданняў, дзе могуць размяшчацца праграмы кандыдатаў, аднак рэдакцыя гэтай газеты безпадстаўна перадала праграму ў іншую гарадскую газету "Вячэрні Мінск", дзе яна і была надрукаваная.

Кандыдат ад БСДП па Берасцейскай-Памежнай акрузе №4 Ігар Маслоўскі толькі пасля абскарджвання ў АВК дамогся апублікавання сваёй праграмы ў газеце "Вячэрні Брэст": перашапачаткова рэдакцыя адмовілася друкаваць праграму кандыдата на той падставе, што ў ёй утрымліваўся заклік не падтрымліваць кандыдатаў ад улады. Разам з тым кандыдат акцэнтуе ўвагу на тое, што наклад гэтай газеты ня ёсць аднастайным, што парушае нормы выбарчага заканадаўства пра роўнасць кандыдатаў: праграма Маслоўскага была апублікаваная ў газеце "Вячэрні Брэст" ад 24 жніўня 2016 года №67 (2321) накладам 4300 асобнікаў, а праграма іншага кандыдата Уладзіміра Базанава апублікаваная ў газеце "Вячэрні Брэст" №66 (2320) ад 19 жніўня 2016 года накладам 10000 асобнікаў.

Адмовіліся друкаваць перадвыбарчую праграму кандыдата ад АГП па Смаргонскай акрузе №59 Міколы Уласевіча газеты «Астравецкая праўда" (Астравец) і «Светлы шлях» (Смаргонь): абедзве рэдакцыі палічылі, што праграма парушае арт. 47 і ч.1 арт.75 Выбарчага кодэкса. Газета "Вячэрні Мінск" адмовілася публікаваць праграмы кандыдатаў ад АГП Юрыя Хашчавацкага і Паўла Стэфановіча.

Некаторыя з кандыдатаў паведамілі, што пры апублікаванні іх праграм выкарыстоўвалі неабгрунтаваныя рэдактарскія захады: выдаляліся загалоўкі ці назвы праграм, прыбіралася выдзяленне тлустым шрыфтам, цэнзураваліся лозунгі альбо партыйныя лагатыпы на фотаздымках кандыдатаў, якія суправаджалі праграмы.

Дзяржаўныя газеты не дэманстравалі адзінага падыхода што да публікацыі праграм кандыдатаў на інтэрнэт-сайтах адпаведных выданняў: толькі меншасць газеты размясціла праграмы кандыдатаў на сваіх электронных версіях, што відавочна шкодзіць інфармаванасці выбаршчыкаў пра праграмы кандыдатаў.

**Друкаваная і іншая агітацыйная прадукцыя**

Адмова ад дзяржаўнага фінансавання абумовіла памяншэнне колькасці друкаваных агітацыйных матэрыялаў, якія распаўсюджваюцца кандыдатамі. Фактычна толькі ў другой палове агітацыйнага перыяду ў Менску з'явілася больш-меньш заўважная колькасць агітацыйных плакатаў кандыдатаў на стэндаў, а колькасць улётак, што распаўсюджваюцца кандыдатамі застаецца па-ранейшаму невялікая.

Паведамленняў пра перашкоды ў друку ўлётак і плакатаў было меньш у параўнанні з мінулымі выбарчымі кампаніямі. Разам з тым у шэрагу выпадкаў паведамлялася, што друкарні па сваёй ініцыятыве, баючыся магчымых рэпрэсій, адпраўляюць перададзеныя ім макеты ўлётак на папярэднюю цэнзуру ў АВК, што не прадугледжана законам. У некаторых выпадках друкарні адмаўляліся друкаваць матэрыялы, калі кандыдаты самі не ўзгодняць тэкст улётак з АВК: падобная незаконная практыка, паводле кандыдата ад АГП Уладзіміра Шанцава, была ўжытая Магілёўскай узбуйнёнай друкарняй імя Собаля ў дачыненні да матэрыялаў гэтага кандыдата, а таксама іншага кандыдата ад АГП Сяргея Смалякова.

Кандыдатам ад праўладнай РППС па Сеніцкай акрузе №76 Васілём Задняпраным былі надрукаваны плакаты без выходных дадзеных, за што АВК вынесла яму папярэджанне. Аднак, у пераважнай большасці выпадкаў, калі былі зафіксаваныя падобныя парушэнні з боку іншых праўладных кандыдатаў, яны не мелі належнай ацэнкі з боку выбарчых камісій. У Хоцімску распаўсюджваліся агітацыйныя ўлёткі без выходных дадзеных у падтрымку кандыдата па Крычаўскай выбарчай акрузе №83, старшыні Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў Таццяны Марачкавай. У шэрагу выпадкаў вялікія наклады друкаваных матэрыялаў былі выраблены праўладнымі кандыдатамі па відавочна заніжаных коштах, ніжэй за звычайны рынкавы кошт і сабекошт друку.

Практыка аплаты рэкламных публікацый кандыдатаў у друкаваных СМІ не з'яўляецца пашыранай: зафіксаваныя толькі некалькі падобных выпадкаў. Разам з тым упершыню ў часе агітацыйнай кампаніі кандыдаты ужылі такі сродак агітацыі, як размяшчэнне рэкламных білбордаў: гэты сродак скарысталі кандыдатка ад кампаніі "Гавары праўду" Таццяна Караткевіч у Мінску, кандыдат ад праўладнай Беларускай патрыятычнай партыі Леанід Брыч у Брэсце, беспартыйныя кандыдаты Алег Леўшуноў і Дзмітры Гурскі ў Гомелі, грамадскі актывіст з Магілёва Юрый Стукалаў.

У шэрагу выпадкаў кандыдаты ад апазіцыйных партый сутыкнуліся з цэнзурай тых звестак і фотаздымкаў, якія былі імі прадстаўленыя для публікацыі на агульных плакатах, што вырабляюцца АВК.

Кандыдат у дэпутаты ад Партыі БНФ па Магілёўскай-цэнтральнай акрузе №85 Зміцер Салаўёў абвінаваціў АВК ў выкарыстанні няўзгодненага з ім фотаздымка. Як адзначае Салаўёў у сваёй скарзе ад 31 жніўня ў абласную ТВК, падчас рэгістрацыі яго кандыдатам у дэпутаты ён падаў у камісію сваю біяграфію і фотана фоне банераў Партыі БНФ, дзе было намалявана шмат гербаў "Пагоня" з надпісамі пад кожным "Партыя БНФ". "Тэкст біяграфіі я ўзгадніў з АВК, а да фатаграфіі пытанняў у камісіі не было. Аднак, калі я ўбачыў выраблены АВК агульныя плакаты з біяграфічнымі дадзенымі кандыдатаў у дэпутаты, то выявіў, штона плакаце надрукаваны іншы здымак, на якім я сфатаграфаваны ў іншай вопратцы і на чыста белым фоне, г.зн. на фоне фотаздымка адсутнічае ўказаны банер Партыі БНФ", - сказаў Зміцер Салаўёў. Аналагічным чынам быў адкарэктаваны фатаздымак кандыдата ад Партыі БНФ па Асіповіцкай акрузе №89 Альберта Яўменава: з яго фатаздымку знік фон з герба "Пагоня" і надпісу "БНФ".

АВК спрабавала аналагічным чынам адцэнзураваць фатаздымак, прадстаўлены кандыдаткай ад Партыі БНФ па Пухавіцкай акрузе №65 Наталляй Ільініч, а таксама запатрабавала, каб біяграфічныя звесткі кандыдатка пераклала з беларускай на рускую мову Аднак найбольшыя

спрэчкі разгарнуліся вакол біяграфіі кандыдата — праз рэдактуру камісіі з біяграфіі зніклі ўсе дадзеныя, якія характарызуюць кандыдата са станоўчага боку і якія могуць быць важныя для выбаршчыкаў: камісія выкрасліла звесткі пра тое, што спадарыня Наталля нарадзілася ў сям’і настаўнікаў, што яна — настаўнік вышэйшай катэгорыі, што зараз займаецца аграэкатурызмам, рэдагуе настаўніцкі метадычны сайт acenka.by і з’яўляецца сябрам Таварыства беларускай школы. Пасля правак камісіі знік таксама сказ: “Пісьменніца Святлана Алексіевіч, лаўрэат Нобеля–2015, падтрымала маю кандыдатуру і ўвайшла ў ініцыятыўную групу”. Толькі пасля абскарджвання ў абласную камісію кандыдатка дамаглася ўнясення на плакаты звестак, якія аб'ектыўна характэрызуюць яе (але ўзгадку пра Нобелеўскага лаўрэата адстаяць не атрымалася).

АВК спрабавала адцэнзураваць біяграфію і кандыдата ад партыі "Зялёныя" па Светлагорскай акрузе №46 Юрыя Ляшэнкі: яна адмовіласядрукаваць цалкам яго біяграфію, патлумачыўшы, што “біяграфія не павінна адрозніваца ад біяграфій іншых кандыдатаў”. АВК не спадабаўся пералік грамадскіх пасад і актыўнай дзейнасці Юрыя Ляшэнкі па стварэнні новых працоўных месцаў у раёне, абароне правоў інвалідаў, захадах па адстойванні інтарэсаў мясцовых жыхароў у барацьбе з чыноўнікамі, змаганні супраць будаўніцтва шкоднай вытворчасці ў горадзе. Кандыдат абурыўся такімі дзеяннямі камісіі, бо не лічыць, што людзі павінны мець “аднолькавыя біяграфіі”, і накіраваў скаргу ў ЦВК, якая падтрымала пазіцыю кандыдата.

З біяграфіі кандыдата ад Партыі БНФ па Пастаўскай акрузе №29 Віктара Карыбут-Дашкевіча АВК прыбрала пункт пра нацыянальную прыналежнасць (літвін) і пра веравызнанне (каталік), што, на думку кандыдата, скіравана на стварэнне скажонага ўспрыняцця выбаршчыкамі асобаў кандыдатаў у раёне з пераважна каталіцкім насельніцтвам. З біяграфіі кандыдата ад АГП па Гарадзенскай-Кастрычніцкай акрузе №50Віктара ДанільчыкаАВК пры вырабы агульных плакатаў былі выкрэсленыя некалькі абзацаў пра яго грамадскую дзейнасць.

Пры аналізе агульных плакатаў кандыдатаў заўважна, што амаль паўсюль звесткі пра кандыдатаў, падтрыманых уладамі, больш падрабязныя і большыя па аб'ёме, чым звесткі апазіцыйных кандыдатаў, якія былі безпадстаўна скарочаныя камісіямі пры вырабы плакатаў.

Варта адзначыць, што дзяржаўныя СМІ у часе асвятлення агітацыйнай кампаніі не паведамляюць пра дзеянні апазіцыйных кандыдатаў і палітычных партый. Значана больш увагі надаецца асвятленню дзеянням выбарчых камісій, агульняй інфармацыі пра статыстыку і прававое рэгуляванне выбарчага працэсу. Часам публікуюцца паведамленні пра дзеянні кандыдатаў, якія падтрымліваюцца ўладамі.

## Правядзенне масавых мерапрыемстваў і сустрэч з выбаршчыкамі

У цэлым прадугледжаны арт.45[1] Выбарчага кодэкса заяўляльны парадак правядзення передвыбарчых сходаў, пікетаў і мітынгаў выконваецца. Разам з тым па-ранейшаму заяўляльным парадкам (які прадугледжвае паведамленне за два дні да мерапрыемства) могуць карыстацца толькі каныдыдаты і іх давераныя асобы. Іншыя грамадзяне, калі яны хочуць правесці масавае мерыпрыемства (у тым ліку агітацыйнага характару) павінны прасіць дазвол у выканаўчай улады за 15 дзён да даты правядзеннямі дае магчымасць дзяржаўным органам адвольна забараніць правядзенне любога мерапрыемства. Падобнае дваістае рэгуляванне агітацыйных мерапрыемстваў стварае перашкоды для роўнага ўдзелу ў агітацыі кандыдатаў ды іншых суб'ектаў, што яскрава праявілася ў часе бягучай агітацыйнай кампаніі: у дачыненні да удзельнікаў масавай акцыі ў Мінску 25 жніўня былі складзеныя пратаколы пра адміністрацыйнае правапарушэнне.

Мінгарвыканкам паведаміў кандыдату ад Партыі БНФ па Аўтазаводскай акрузе №92 у Мінску Аляксею Янукевічу, што запланаваныя ім мерапрыемствы ў цэнтры горада па-за межамі

выбарчай акругі не могуць быць праведзеныя а заяўляльным прынцыпе, хоць падобнага кшталту абмежаванне не зафіксаванае выбарчым заканадаўствам. ЦВК падтрымала гэткае абмежавальнае тлумачэнне, выводзячы яго з "агульнага прынцыпу правядзення выбараў па аднамандатных акругах".

ЦВК паведамляе пра надзвычай вяліку колькасць паведамленняў пра правядзенне масавых мерапрыемсваў у межах кампаніі: на 1 верасня паведамляецца пра атрыманне органамі выканаўчай клады 180 тыс. заявак пра правядзенне масавых агітацыйных мерапрыемстваў. У тым ліку 173514 паведамленні пададзеныя кандыдатамі ў Мінску. Аднак трэба ўлічваць, што толькі абсалютная меншасць гэтых мерапрыемстваў праводзіцца ў рэальнасці: некаторыя кандыдаты загадзя рэзервуюць праз паведамленні найбольш зручныя для агітацыі месцы на ўвесь перыяд кампаніі, выкарыстоўваючы на практыцы іх толькі ў асобных выпадках.

У дачыненні да сустрэчаў у памяшканнях, вызначаных для сустрэч з выбаршчыкамі, такая тактыка асобных кандыдатаў фактычна пазбаўляе іншых кандыдатаў ладзіць сустрэчы: у Дамброўскай выбарчай акрузе №103 у Мінску старшыня Фрунзенскай раённай арганізацыі “Белая Русь” Віталій Місевец заняў ўсе існуючыя на тэрыторыі акругі памяшканні. У выніку кандыдат ад АГП і сябра БХД Вольга Кавалькова здолела дамагчыся правядзення толькі дзьвух сустрэч з выбаршчыкамі: "Адразу пасля рэгістрацыі мяне кандыдатам у дэпутаты я падала заяву аб правядзенні сустрэч з выбаршчыкамі. З камісіі я атрымала адказ, што мне дазволяць праводзіць сустрэчы вечарам толькі ў некаторыя дні. У астатні час – такія сустрэчы я магу арганізаваць толькі да пяці гадзін вечара, бо праўладны кандыдат напісаў заяву на падобныя сустрэчы раней на ўсе дні пачынаючы з пяці гадзін вечара" - сказала Вольга Кавалькова. Цікавасць сітуацыі яшчэ і ў тым, што акрамя Кавальковай і Місеўца балатуецца яшчэ чатыры кандыдаты. Атрымліваецца, што і астатнія кандыдаты пазбаўлены магчымасці сустракацца з выбаршчыкамі.

Сустрэчы з выбаршчыкамі ў памяшканнях не карыстаюцца ўвагай насельніцтва: у пераважнай большасці выпадкаў на іх прыходзіць мала людзей. Але ў дачыненні да праўладных кандыдатаў адміністрацыі дзяржаўных прадпрыемстваў выкарыстоўваюць адміністрацыйны рэсурс для запаўнення аўдыторыі на сустрэчы, а таксама перашкаджаюць выступаць на падобных сустрэчах прадсаўнікам апазіцыйных кандыдатаў. Праўладныя кандыдаты таксама праводзяць сустрэчы з выбаршчыкамі ў працоўны час на разнастайных прадпрыемствах. Напрыклад, праўладны кандыдат па Гродзенскай-Ленінскай акрузе №52 Тамара Даўгашэй правяла сустрэчу з работнікамі закрытага прадпрыемства "Колерліт"непасрэдна на прадпрыемстве і ў працоўны час. 30 жніўня кандыдату ў дэпутаты па Магілёўскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №85 ад АГП, сябру аргкамітэту БХД Алегу Аксёнаву сарвалі сустрэчу з выбаршчыкамі ў школе, якая вызначаная як месца для сустрэч з выбаршчыкамі: адміністрацыя школы папросту адмовілася прадаставіць памяшканне, якое прадугледжана для сустрэчаў. Кандыдат напісаў скаргу на дзеянні адміністрацыі школы ў АВК.

АВК не заўсёды анансуюць час і месца сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі: гэта датычыцца як вулічных сустрэч, так і сустрэч у памяшканнях.